ЗКП2
П20

Н. С. ПАТОЛІЧАЎ

# СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ XXII З'ЕЗДУ КПБ

★

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1956

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

3К1У2
П20

*Н. С. ПАТОЛІЧАЎ*

# СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ XXII З'ЕЗДУ КПБ

Урадавая Бібліятэка імя ГОРКАГА
Інв. № 302195
Ф.Н.
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Президентская библиотека Республики Беларусь
8 800001 04497

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя палітычнай літаратуры
МІНСК 1956

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Таварышы! З часу XXI з'езда Камуністычнай партыі Беларусі прайшло два гады. Гэта — параўнальна невялікі, але вельмі важны перыяд у жыцці нашай Радзімы. Савецкі народ, кіруемы слаўнай Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза, паспяхова завяршыўшы пяты пяцігадовы план, дабіўся новых поспехаў у развіцці эканомікі і культуры, ва ўмацаванні магутнасці Савецкай дзяржавы і ўпэўнена ідзе па шляху будаўніцтва камунізма.

Цяпер наша краіна знаходзіцца напярэдадні XX з'езда КПСС. З'езд падвядзе вынікі велізарнай стваральнай работы, праведзенай савецкім народам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі з часу яе XIX з'езда, зацвердзіць Дырэктывы па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР і далёка наперад асветліць шляхі далейшага развіцця сацыялістычнага грамадства.

Апублікаваны праект Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1956—1960 гады паказвае, якія велічныя задачы ставіць наша партыя на бліжэйшыя гады, якія велізарныя сродкі мае Савецкая дзяржава для далейшага, яшчэ больш магутнага і хуткага развіцця народнай гаспадаркі. У праекце Дырэктыў па шостаму пяцігадоваму плану адлюстравана непахісная воля нашай партыі, савецкага народа цвёрда ісці па шляху, указаным нам вялікім Леніным. Галоўныя задачы шостага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР заключаюцца ў тым, каб на базе пераважнага развіцця цяжкай прамысловасці, няспыннага тэхнічнага прагрэсу і павышэння прадукцыйнасці працы забяспечыць далейшы магутны рост усіх галін народнай гаспадаркі, ажыццявіць круты

ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці і на гэтай аснове дабіцца значнага павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню савецкага народа.

Партыя і яе Цэнтральны Камітэт свята выконваюць ленінскі запавет аб тым, што рашаючым звяном будаўніцтва комунізма ў СССР з'яўляецца ўсямернае і хуткае развіццё соцыялістычнай індустрыі і ў першую чаргу цяжкай прамысловасці. У якасці першачарговых задач шостай пяцігодкі ў галіне прамысловасці праект Дырэктыў намячае далейшае развіццё чорнай і каляровай металургіі, нафтавай, вугальнай і металургічнай прамысловасці, забеспячэнне апярэджваючых тэмпаў будаўніцтва электрастанцый, хуткі рост машынабудавання, асабліва выпуску тэхнічна дасканалых станкоў, кавальска-прэсавых машын, сродкаў аўтаматыкі і прыбораў.

Шостая пяцігодка будзе пяцігодкай далейшага магутнага развіцця прадукцыйных сіл у краіне, пераходу народнай гаспадаркі на больш высокі тэхнічны ўзровень вытворчасці, пяцігодкай сур'ёзнага павышэння ўсіх якасных паказчыкаў і паляпшэння гаспадарчага кіраўніцтва.

Совецкі народ з пачуццём вялікай радасці сустрэў, актыўна абмяркоўвае і горача адабрае праект Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану. Сходы працоўных і гутаркі, якія праходзяць цяпер на заводах, у калгасах, соўгасах, МТС і ўстановах, паказваюць, што шырокія народныя масы праяўляюць найглыбейшую цікавасць да гэтага важнейшага дакумента і выказваюць імкненне выявіць новыя рэзервы і ўнутраныя магчымасці, якія мае соцыялістычная эканоміка. Абмеркаванне праекта Дырэктыў яскрава сведчыць аб тым, што шосты пяцігадовы план з'яўляецца кроўнай справай мільёнаў, з новай сілай дэманструе непарушнае адзінства партыі, урада і народа.

Таварышы! За прайшоўшыя пасля XXI з'езда КПБ два гады працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый дабіліся новых поспехаў у развіцці эканомікі і культуры. Гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы штодзённым клопатам і велізарнай дапамозе ЦК КПСС і Саюзнага ўрада. Беларускі народ поўны пачуцця глыбокай удзячнасці Цэнтральнаму Камітэту нашай роднай Комуністычнай партыі і Совецкаму ўраду за іх пастаянную ўвагу да нашай рэспублікі і няспынныя клопаты аб яе развіцці. *(Апладысменты)*.

У шостай пяцігодцы намячаецца яшчэ больш хуткае развіццё народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі. Беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, глыбока ўсведамляе тыя вялікія мэты і задачы, якія перад ім устаюць, і прыкладзе ўсе свае сілы, каб паспяхова іх выканаць.

Комуністычная партыя Беларусі прыйшла да свайго XXII з'езда яшчэ больш загартаваным і баявым атрадам і сустракае XX з'езд КПСС цесна згуртаванай вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта КПСС, бязмежна адданай вялікай справе будаўніцтва комунізма. *(Апладысменты).*

## I. ЗА ДАЛЕЙШЫ ЎЗДЫМ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС

Таварышы! Прайшоўшыя пасля папярэдняга з'езда КПБ гады азнаменаваліся далейшым развіццём соцыялістычнай прамысловасці рэспублікі. Прамысловасць расце як за кошт будаўніцтва новых, так і за кошт расшырэння дзеючых прадпрыемстваў. У 1955 годзе аб'ём прамысловай вытворчасці ў адносінах да 1953 года (за 2 гады) узрос на 33 працэнты.

Ажыццёўлена буйное капітальнае будаўніцтва. За 1954—1955 гады ў народную гаспадарку рэспублікі ўкладзена 6 мільярдаў рублёў капітальных укладанняў, з іх каля 50 працэнтаў — у прамысловасць.

Падвядзенне вынікаў нашай работы за справаздачны перыяд супадае з заканчэннем пятай пяцігодкі. Цэнтральны Камітэт дакладвае XXII з'езду КПБ, што народнагаспадарчы план пятай пяцігодкі выканан прамысловасцю Совецкай Беларусі датэрмінова — у лістападзе 1955 года. У пятай пяцігодцы дасягнут значны ўздым прамысловасці і ўсёй народнай гаспадаркі рэспублікі. Прамысловая вытворчасць у Беларусі за пяцігоддзе ўзрасла больш чым у 2 разы. У 1955 годзе выпрацавана валавой прадукцыі ў 2,4 раза больш, чым у даваенным 1940 годзе.

За гады пятай пяцігодкі ўсе капітальныя ўкладанні ў народную гаспадарку рэспублікі склалі больш 12 мільярдаў рублёў, або прыкладна на 44 працэнты больш, чым за папярэдняе пяцігоддзе.

За гэтыя гады ў рэспубліцы пабудавана многа новых буйных прамысловых прадпрыемстваў. Заводы і фабрыкі

аснашчаліся перадавой тэхнікай, павышаўся культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа. Усё гэта забяспечыла рост прадукцыйнасці працы за пяцігоддзе на 58 працэнтаў.

Значна змянілася структура прамысловай вытворчасці, павысілася ўдзельная вага галін цяжкай прамысловасці — энергетычнай, паліўнай і машынабудаўнічай. Выпрацоўка **электраэнергіі** за пяцігоддзе павялічылася ў 2,4 раза і ў параўнанні з даваенным узроўнем — у 3,6 раза. Здабыча торфу за пятую пяцігодку павялічылася ў 1,9 раза.

Аднак, нягледзячы на некаторыя станоўчыя вынікі ў развіцці паліўнай і энергетычнай прамысловасці, яе ўзровень яшчэ не задавальняе ўзрастаючыя патрэбы народнай гаспадаркі. Партыйныя арганізацыі павінны ўзмацніць увагу да гэтых галін прамысловасці, забяспечыўшы іх паскоранае развіццё. Важнейшай задачай з'яўляецца ўвод новых магутнасцей на электрастанцыях, пашырэнне і будаўніцтва новых торфапрадпрыемстваў. У гады шостай пяцігодкі выпрацоўка электраэнергіі павінна павялічыцца прыкладна ў 2,1 раза. Трэба будзе ўвесці ў эксплуатацыю Васілевіцкую ДРЭС, ажыццявіць будаўніцтва Віцебскай гідраэлектрастанцыі, значна пашырыць Мінскую ЦЭЦ-3, Смалявіцкую ДРЭС, Віцебскую ЦЭЦ і іншыя электрастанцыі. Асаблівая ўвага павінна быць удзелена будаўніцтву Васілевіцкай ДРЭС, маючы на ўвазе зусім нецярпімае становішча з электраэнергіяй, якое стварылася ў Гомельскай вобласці.

Важнейшай задачай у справе ўстойлівага электразабеспячэння народнай гаспадаркі з'яўляецца стварэнне разгалінаванай сеткі высокавольтавых ліній электраперадач, развіццё гарадскіх электрасетак. У бліжэйшы час неабходна поўнасцю закончыць электрыфікацыю ўсіх раённых цэнтраў, забяспечыўшы іх устойлівым энергазабеспячэннем. Трэба ўзмацніць электрыфікацыю калгасаў, шырока выкарыстоўваючы іх сродкі.

У сувязі з неабходнасцю ўмацаваць у рэспубліцы паліўную базу першачарговай задачай з'яўляецца далейшае развіццё **тарфяной прамысловасці.** К канцу шостай пяцігодкі гадавая здабыча торфу ў рэспубліцы павінна павялічыцца ў 1,8 раза. Работнікі тарфяной прамысловасці ў гэтым пяцігоддзі павінны завяршыць комплексную механізацыю здабычы фрэзернага торфу, а таксама механізацыю вымання, сцілкі, уборкі і пагрузкі кавалкавага

торфу, транспартных, балотна-падрыхтоўчых і дапаможных работ.

За справаздачны перыяд дасягнуты значныя поспехі ў развіцці **машынабудаўнічай прамысловасці.** Машынабудаванне ўзрасло за пяцігодку больш чым у пяць разоў. Хутка растуць нашы вядучыя прадпрыемствы, якія даюць народнай гаспадарцы ўсё больш трактараў, аўтамабіляў, станкоў, веласіпедаў, матацыклаў.

Далейшае развіццё набылі прадпрыемствы будаўнічага, дарожнага і меліярацыйнага машынабудавання, радыётэхнічнай прамысловасці і іншыя.

У рэспубліцы пачалося будаўніцтва новых буйных машынабудаўнічых прадпрыемстваў — заводаў аўтаматычных ліній, электрашчытоў, радыёдэталей, сельгасмашынабудавання і іншых. Уступаюць у лік дзеючых прадпрыемстваў Мінскі завод запасных трактарных дэталей і першая чарга Мінскага гадзіннікавага завода.

Задача заключаецца ў тым, каб і надалей удзяляць вялікую ўвагу машынабудаўнічай галіне прамысловасці, якая з'яўляецца асновай далейшага тэхнічнага прагрэсу і індустрыяльнага развіцця рэспублікі.

У праекце Дырэктыў па шостаму пяцігадоваму плану па Беларускай ССР прадугледжваецца **павелічэнне выпуску валавой прадукцыі прамысловасці** прыкладна ў 1,7 раза. Аб'ём дзяржаўных капітальных укладанняў у народную гаспадарку за 1956—1960 гады вызначаецца прыкладна ў 17 мільярдаў рублёў.

У параўнанні з 1955 годам павінна быць дасягнута павелічэнне на канец пяцігодкі: выпуску трактароў— у 2,7 раза, аўтамабіляў—у 1,6 раза, матацыклаў— у 1,7 раза, металарэжучых станкоў—у 2 разы, цэменту— у 1,8 раза, скуранога абутку — у 1,4 раза, цукру — у 3,1 раза.

У рэспубліцы пачнецца будаўніцтва двух буйных нафтаперапрацоўчых заводаў. Будуць пабудаваны таксама два новыя цукровыя заводы, значна расшыраюцца дзеючыя цэментныя заводы, у два разы павялічыцца магутнасць Магілёўскага завода штучнага валакна, на поўную магутнасць будуць уведзены Мінскі камвольны камбінат, гадзіннікавы завод, заводы трактарных запасных частак, аўтаматычных ліній і спецыяльных агрэгатных станкоў.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Прадугледжваецца будаўніцтва новых заводаў па першапачатковай перапрацоўцы ільну і канапель.

У заходніх абласцях рэспублікі намячаецца больш актыўнае развіццё торфаздабываючай прамысловасці, энергетыкі, лёгкай і харчовай прамысловасці.

Будзе пабудаван газаправод Дашава — Мінск — Ленінград, што дазволіць газіфікаваць Мінск і, магчыма, рад іншых гарадоў БССР.

Компартыя Беларусі правяла пэўную работу па далейшаму развіццю **будаўнічай справы,** паляпшэнню якасці, зніжэнню сабекошту будаўнічых работ, павелічэнню вырабу будаўнічых матэрыялаў.

У рэспубліцы праведзена ўзбуйненне будаўнічых арганізацый. Гэта дало магчымасць умацаваць іх кадрамі, лепш забяспечыць тэхнікай і дабіцца далейшага расшырэння вытворчай базы. Аснашчэнне будаўнічай тэхнікай дало магчымасць механізаваць земляныя работы прыкладна на 90 працэнтаў, пагрузачна-разгрузачныя — на 54 працэнты, тынкавальныя — на 42 працэнты, малярныя — на 52 працэнты.

У будаўніцтве набылі некаторае развіццё індустрыяльныя метады правядзення работ з выкарыстаннем зборных канструкцый, дэталей і эфектыўных будаўнічых матэрыялаў. У 1955 годзе на 1 мільён рублёў выкананых будаўнічых работ прыпадала каля 90 кубічных метраў зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый — прыкладна ў 2 разы больш, чым у 1954 годзе. У 1956 годзе павінны быць створаны магутнасці па выпуску да 300 тысяч кубічных метраў жалезабетонных вырабаў. З гэтай мэтай будуецца рад заводаў—у Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве.

Прыняты меры па павелічэнню вырабу і расшырэнню асартыменту **будаўнічых матэрыялаў.** За гады пятай пяцігодкі выраб цэглы павялічыўся амаль у два разы, вапны і гіпсу — больш чым у два разы, шыферу — у 7 разоў, арганізаван выраб новых відаў будаўнічых матэрыялаў.

Аднак у будаўніцтве і ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў ёсць буйныя недахопы. Некаторыя міністэрствы і будаўнічыя арганізацыі не выконваюць дзяржаўныя планы капітальнага будаўніцтва і парушаюць устаноўленыя тэрміны ўводу ў дзеянне новых вытворчых магутнасцей, а таксама ўводу ў эксплуатацыю жылых дамоў,



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

школ, бальніц. Гэта, галоўным чынам, датычыць Міністэрства гарадскога і сельскага будаўніцтва БССР (міністр тав. Крэсік). План уласнага будаўніцтва міністэрства выканала на 130 працэнтаў, а план падрадных работ для іншых арганізацый — усяго на 93 працэнты. Не асвоілі значную частку капіталаўкладанняў у 1955 годзе міністэрствы: тэкстыльнай прамысловасці (міністр тав. Сталбоў), сельскай гаспадаркі (міністр тав. Касцюк), соўгасаў (міністр тав. Калінін) і іншыя.

Цэнтральны Камітэт КПБ вымушан быў двойчы разглядаць пытанне аб дрэнным будаўніцтве Мінскага завода жалезабетонных вырабаў. Будуе гэты завод Міністэрства гарадскога і сельскага будаўніцтва, а заказчыкам з'яўляецца Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР. Марудна будуецца ў Мінску камвольны камбінат.

На мінулым з'ездзе крытыкаваўся міністр прамысловасці будаўнічых матэрыялаў тав. Ісідараў. Хоць міністэрства некалькі і палепшыла работу, але па выніках 1955 года яно з'яўляецца адзіным прамысловым міністэрствам, якое не выканала плана выпуску валавой прадукцыі. У нас ёсць многа ўзораў новых будаўнічых матэрыялаў, але іх мала ўкаранёна ў масавую вытворчасць.

Будаўнічыя арганізацыі і многія заказчыкі па-ранейшаму слаба змагаюцца за высокую якасць будаўнічых работ. У дзейнасці многіх архітэктараў і праектных арганізацый атрымаў шырокае распаўсюджанне знешнепаказны бок архітэктуры, з вялікімі празмернасцямі, што не адпавядае лініі партыі і ўрада ў архітэктурна-будаўнічай справе і строга асуджана Цэнтральным Камітэтам КПСС і Саветам Міністраў СССР.

Возьмем, напрыклад, будынак тэлевізійнага цэнтра. Пры пераглядзе праекта толькі фасаднай часткі былі зняты празмернасці прыкладна на 500 тысяч рублёў. Архітэктар запраектаваў паставіць на фасадзе вялікую колькасць скульптурных фігур, якія не маюць, трэба думаць, ніякіх адносін да тэлебачання. І калі пускавы перыяд тэлецэнтра зацягваецца, то, вядома, не з-за таго, што на фасадах не ставяць фігур. Як відаць, вінаваты ў гэтым некаторыя іншыя фігуры. *(Ажыўленне ў зале)*. Або вось жылы дом на рагу Ленінскай і Інтэрнацыянальнай вуліц у Мінску. Аўтар праекта архітэктар Заборскі, аддаючы даніну фармалізму, усё падпарадкаваў вонка-

ваму выгляду дома, нікольki не клапоцячыся аб зручнасцях жыхароў. У выніку калідор у трохпакаёвай кватэры мае зігзагападобную форму, і яго ўжо некаторыя з жартаўнікоў называюць, накшталт аднаго з маскоўскіх, Крывакаленным завулкам. *(Смех).* У гэтых кватэрах няма ніводнага пакоя, які мае нармальную форму, усе сцены чамусьці розныя па велічыні *(смех),* а ў іншых пакоях у цэнтры стаяць два слупы. *(Смех).* Вось да якіх фармалістычных скрыўленняў даходзяць некаторыя нашы архітэктары. Зразумела, што з такімі фактамі ў архітэктурнай і будаўнічай практыцы трэба рашуча змагацца.

У шостай пяцігодцы ў Беларусі будзе значна расшырана капітальнае будаўніцтва. Каб паспяхова справіцца з новай праграмай будаўніцтва, неабходна рашуча ліквідаваць недахопы, прыняць энергічныя меры для далейшага паляпшэння будаўнічай справы.

Будаўнічым арганізацыям рэспублікі трэба ў бліжэйшыя гады завяршыць у асноўным комплексную механізацыю земляных, пагрузачна-разгрузачных работ, а таксама работ па мантажу канструкцый; усямерна развіваць комплексную механізацыю аддзелачных і іншых будаўнічых работ. Трэба таксама значна палепшыць арганізацыю будаўнічай вытворчасці і працы рабочых-будаўнікоў, рашуча павесці барацьбу з безгаспадарчасцю.

Нам неабходна ўсямерна развіваць вытворчасць будаўнічых матэрыялаў на дзеючых заводах, паскорыць увод новых магутнасцей, значна палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі. У сувязі з шырокім размахам сельскага і калгаснага будаўніцтва важнейшай задачай з'яўляюцца расшырэнне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у мясцовай і кааператыўнай прамысловасці, а таксама арганізацыя вырабу сценавых матэрыялаў, чарапіцы, вапны і іншых будаўнічых матэрыялаў сіламі калгасаў.

У рэспубліцы значнае развіццё набыла прамысловасць, якая выпускае **тавары народнага спажывання.** Аб'ём валавой прадукцыі міністэрстваў: лёгкай прамысловасці, тэкстыльнай прамысловасці, прамысловасці харчовых тавараў, прамысловасці мясных і малочных прадуктаў у 1955 годзе ў параўнанні з 1950 годам павялічыўся прыкладна на 3,6 мільярда рублёў, або на 89 працэнтаў. Прадукцыя Міністэрства мясцовай і паліўнай прамысловасці і промыславай кааперацыі, якія ў значнай меры таксама вырабляюць прадметы народнага спажывання, за гэтыя



Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

гады ўзрасла на 2 мільярды рублёў, або больш чым у два разы.

За гэтыя гады ўведзен у эксплуатацыю рад прадпрыемстваў, якія вырабляюць тавары народнага спажывання: 1-я чарга Мінскага камвольнага камбіната, Віцебская шоўкаткацкая фабрыка, пяць ільнозаводаў, пяць хлебазаводаў, Пінскі мясакамбінат, Крычаўскі птушкакамбінат, Аршанскі завод плаўленых сыроў, 14 масласырзаводаў. Значна расшырыліся Магілёўскі завод штучнага валакна, віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і іншыя. Будуюцца восем швейных фабрык, буйныя мясакамбінаты ў Мінску, Маладзечна, Бабруйску і Брэсце. Значна павялічаны вытворчыя магутнасці за кошт новага будаўніцтва і расшырэння дзеючых прадпрыемстваў у промыславай кааперацыі і мясцовай прамысловасці.

Наша задача заключаецца ў тым, каб павялічыць выпуск гэтых тавараў, арганізаваць вытворчасць новых відаў вырабаў шырокага спажывання і гаспадарчага ўжытку, расшырыць асартымент, павышаць якасць іх, максімальна выкарыстоўваць мясцовыя сыравінныя рэсурсы. Неабходна ўсямерна развіваць народныя мастацкія промыслы. Мы абавязаны значна расшырыць сетку прадпрыемстваў па абслугоўванню бытавых патрэб насельніцтва і палепшыць культуру іх работы.

У вырашэнні задач развіцця народнай гаспадаркі важная роля належыць **транспарту і сувязі**. Работнікі транспарту дабіліся некаторага паляпшэння сваёй работы. Грузаабарот і пасажырскія перавозкі Беларускай чыгункі за пяцігодку павялічыліся ў 1,5 раза. За справаздачны перыяд Беларуская чыгунка выканала план пагрузкі, выгрузкі і абароту вагонаў, пачала працаваць рэнтабельна.

Аб'ём грузавых перавозак аўтамабільнага транспарту за два гады ўзрос у 3 разы, а пасажырскіх перавозак — у 2,5 раза. Працягласць пастаянна дзеючых аўтобусных маршрутаў за апошнія пяць год павялічылася на 14 тысяч кіламетраў, або амаль у два разы, што дазволіла значна палепшыць абслугоўванне насельніцтва рэспублікі і звязаць абласныя цэнтры з многімі раёнамі. За гэты час пабудавана і рэканструявана 2 036 кіламетраў дарог з цвёрдым пакрыццём і пабудавана 17 700 пагонных метраў мастоў.

У рэспубліцы працягвала расці сетка прадпрыемстваў

сувязі, павялічылася працягласць авіяліній, з кожным годам паляпшаліся радыёфікацыя і тэлефанізацыя сельскай мясцовасці. Пабудаваны Цэнтральны паштамт і першая чарга тэлевізійнага цэнтра ў Мінску.

Аднак трэба сказаць, што транспарт і сувязь усё яшчэ не забяспечваюць узрастаючыя патрэбы насельніцтва і народнай гаспадаркі. На прайшоўшых гарадскіх і абласных партыйных канферэнцыях рэзка і справядліва крытыкаваліся сур'ёзныя недахопы ў рабоце аўтатранспарту па абслугоўванню насельніцтва. Міністэрству аўтамабільнага транспарту і шасэйных дарог БССР і міністру тав. Драбышэўскаму неабходна ўважліва прыслухацца да гэтай крытыкі. З-за недахопаў у рабоце чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту прамысловыя прадпрыемствы затарваюцца і нясвоечасова забяспечваюцца сыравінай, матэрыяламі і палівам. Далейшае развіццё народнай гаспадаркі рэспублікі патрабуе значнага паляпшэння работы транспарту і сувязі.

Таварышы! Ліпеньскі Пленум ЦК КПСС даў совецкаму народу баявую праграму барацьбы за далейшы тэхнічны прагрэс нашай прамысловасці. Яна прадугледжвае карэнны паварот у бок новай тэхнікі і тэхналогіі, перадавой арганізацыі працы і вытворчасці. Шостая пяцігодка, як сказана ў праекце Дырэктыў XX з'езда КПСС, будзе пяцігодкай шырокага ўкаранення новай тэхнікі ва ўсе галіны народнай гаспадаркі.

Нашы прамысловыя прадпрыемствы і асабліва новыя няспынна папаўняюцца сучаснай высокапрадукцыйнай тэхнікай. Многа навейшага абсталявання атрымалі трактарны, аўтамабільны, падшыпнікавы, мотавеласіпедны і іншыя заводы. Навейшай тэхнікай аснашчаюцца гадзіннікавы завод і завод трактарных запасных дэталей, якія будуюцца. На заводзе запчастак упершыню ў рэспубліцы будзе ўжыта высокачастотнае электранаграванне загатовак, а ковачныя молаты заменены прэсавым абсталяваннем. На электрастанцыях устанаўліваецца абсталяванне больш высокіх параметраў, укараняецца аўтаматыка. Значна папоўніліся новай тэхнікай торфапрадпрыемствы, прадпрыемствы лёгкай, тэкстыльнай і харчовай прамысловасці.

За справаздачны перыяд прамысловасцю рэспублікі асвоена значная колькасць новых машын, станкоў і вырабаў. Аўтамабільны завод распачаў выпуск магутных леса-

возных аўтамабіляў, трактарны завод сканструяваў і рыхтуе выпуск новага тралёвачнага дызельнага трактара для лясной прамысловасці, Гомельскі завод сельгасмашынабудавання ў мінулым годзе распачаў масавы выпуск сіласаўборачных камбайнаў. Станкабудаўнічымі заводамі асвоен выраб 115 тыпаў станкоў. Падшыпнікавы завод асвоіў выраб некалькіх новых тыпаў падшыпнікаў. Асвоен выпуск многіх відаў тавараў шырокага ўжытку: радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў і іншых вырабаў.

На прадпрыемствах праводзіцца работа па ўдасканаленню тэхналагічных працэсаў і ўкараненню перадавых метадаў працы. У металаапрацоўцы працягвалася ўкараненне скорасных метадаў апрацоўкі металу, высокапрадукцыйнай тэхналагічнай аснасткі, паточных ліній і канвеернай зборкі.

На Мінскім мотавелазаводзе сістэматычна праводзіцца работа па ўкараненню дакладнага ліцця па выплаўляемых мадэлях. Ад укаранення гэтага метаду толькі па двух дэталях — вынас руля і вузел карэткі веласіпеда — завод у 1955 годзе сэканоміў 330 тон пракату, 125 тон ліста, выслабаніў 12 прэсаў, молат, 12 штампаў, 6 свідравальных станкоў, 4 фрэзерныя станкі, печ, зварачны агрэгат, 16 адзінак абсталявання і 70 рабочых. Гэта дало заводу 1 200 тысяч рублёў гадавой эканоміі. У сучасны момант завод асвойвае па гэтаму метаду яшчэ 8 дэталей.

На трактарным заводзе пачалі ўжываць на апрацоўцы дэталей метад фрэзеравання ў напрамку руху дэталі. У выніку скараціўся час вырабу дэталей і павысілася якасць іх апрацоўкі. Падлічана, што, ужыўшы новы метад фрэзеравання, на адным станку можна даць 5—6 тысяч рублёў эканоміі ў год.

Увага да пытанняў укаранення прагрэсіўнай тэхналогіі на прадпрыемствах рэспублікі асабліва ўзмацнілася пасля ліпеньскага Пленума ЦК КПСС. Партыйнымі арганізацыямі і калектывамі прадпрыемстваў выяўляюцца сур'ёзныя недахопы. Гэтыя недахопы, перш за ўсё, заключаюцца ў марудным укараненні ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі, у недастатковым веданні гэтых дасягненняў кіруючымі кадрамі, у дрэнным выкарыстанні вялікіх рэзерваў прадпрыемстваў, недастатковым узроўні механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Ёсць факты, калі будаўніцтва новых і рэканструкцыя старых прадпрыемстваў праводзяцца без уліку перадавой тэхнікі

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

і тэхналогіі. Гэта мела месца на Жодзінскім заводзе дарожных і меліярацыйных машын, мінскім заводзе «Ударнік».

Некаторыя ўзоры машын і вырабаў, якія выпускаюцца прамысловасцю рэспублікі, па сваіх тэхнічных характарыстыках адстаюць ад лепшых узораў перадавой тэхнікі. Мінскі завод імя Кірава выпускае гарызантальна-працяжныя станкі (мадэль 7510), якія цяжэй на 1,6 тоны за аналагічныя амерыканскія станкі. Выпускаемыя заводам імя Варашылава аднастоечныя падоўжнастругальныя станкі (мадэль 7134) цяжэй на 4 тоны за аналагічныя англійскія станкі. Такія факты ёсць і ў іншых галінах прамысловасці.

Сур'ёзныя недахопы ёсць на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі ва ўкараненні перадавой тэхналогіі. Усё яшчэ не зжыты коснасць, нежаданне шукаць і ўкараняць новае, перадавое, прагрэсіўнае.

Найбольш адстаючымі ў тэхнічных адносінах у прамысловасці рэспублікі з'яўляюцца нарыхтоўчыя цэхі. У гэтых цэхах пераважае ручная праца, працвітае саматужніцтва, адсутнічае якая-небудзь механізацыя. Гэта значна стрымлівае рост вытворчасці, прыводзіць да штурмаўшчыны.

На мінскіх партыйных канферэнцыях сур'ёзна крытыкаваўся завод імя Варашылава (дырэктар тав. Якімчык, галоўны інжынер тав. Мангасараў). Як высветлілася, у ліцейнай вытворчасці гэтага завода не ўкаранёны навіны, якія даўно ўжываюцца на іншых прадпрыемствах. Зыманне ліцця з аднаго квадратнага метра плошчы тут значна ніжэйшае, чым на іншых заводах рэспублікі.

На прадпрыемствах рэспублікі вельмі марудна ўкараняюцца ў ліцейную вытворчасць перадавыя вытворчыя працэсы: дакладнае і кокільнае ліццё, ліццё пад ціскам, цэнтрабежнае і коркавае ліццё.

На электрастанцыях Галоўэнергаўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР да гэтага часу няма ніводнага аўтаматызаванага паравога катла, электрастанцыі не забяспечаны неабходнай кантрольна-вымяральнай апаратурай. У выніку гэтага іх эксплуатацыя вядзецца на нізкім узроўні, бываюць аварыі. З-за адсталай тэхналогіі на цагельных заводах міністэрстваў мясцовай і паліўнай прамысловасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і промкааперацыі выпускаецца цэгла нізкай якасці.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

На рэспубліканскім сходзе партыйнага актыву па выніках ліпеньскага Пленума ЦК КПСС востра крытыкаваліся кіраўнікі завода «Гомсельмаш» за тэхнічную адсталасць прадпрыемства, але калі праверылі рад іншых заводаў, то выявілася, што «Гомсельмаш» у гэтых адносінах не адзінокі. Такіх тэхнічна адсталых прадпрыемстваў у нас, нажаль, яшчэ многа. Паўстае пытанне, чаму-ж на сходзе актыву абмежаваліся крытыкай толькі «Гомсельмаша»? Тлумачыцца гэта вельмі проста — не ведалі становішча спраў на прадпрыемствах. Адсюль вынікае вывад: трэба глыбей унікаць у эканоміку і вытворчы працэс прадпрыемстваў, супастаўляць іх паказчыкі з тым, каб вучыць людзей на лепшых узорах, крытыкаваць адстаючых, падказваць ім правільныя шляхі ліквідацыі недахопаў.

Мы павінны ўлічваць асаблівасці прамысловасці БССР, яе рознастайнасць. У нас добра спалучаецца пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці з развіццём прамысловасці, якая выпрабляе тавары народнага спажывання. Але рэзка прыкметна тэхнічнае адставанне лёгкай, харчовай і асабліва мясцовай прамысловасці і промысловай кааперацыі. Тут работы яшчэ непачаты край.

Таварышы! Як вядома, ад ступені павышэння прадукцыйнасці працы залежаць поспехі ў развіцці ўсіх галін народнай гаспадаркі, а таксама рост рэальнай заработнай платы, агульны ўздым матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню жыцця народа.

Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці і будаўніцтве Беларусі няўхільна расце. Але ў нас яшчэ ёсць многа фактаў, калі пры патуранні кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў многія прадпрыемствы не выконваюць заданняў па росту прадукцыйнасці працы. Не выканан план па прадукцыйнасці працы за 1955 год Міністэрствам гарадскога і сельскага будаўніцтва БССР, значнай колькасцю прадпрыемстваў іншых міністэрстваў. Асабліва нізкая прадукцыйнасць працы ў раённай і абласной прамысловасці.

Сур'ёзнай перашкодай у росце прадукцыйнасці працы з'яўляецца слабая механізацыя дапаможных работ. Гэтыя работы, як правіла, выконваюцца ўручную. На торфапрадпрыемствах рэспубліканскага падпарадкавання ўдзельная вага ручной працы па здабычы кавалкавага торфу складае больш 50 працэнтаў, а на прадпрыемствах

абласнога падпарадкавання — да 70 працэнтаў. Асабліва нізкі ўзровень механізацыі работ на прадпрыемствах будаўнічых матэрыялаў і харчовых тавараў, на гарбарных заводах, на нарыхтоўках і вывазцы лесу, на будоўлях, на пагрузачна-разгрузачных работах чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту. На электрастанцыях Галоўэнергаўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР палавіна спажываемага торфу падаецца лапатай. Дрэнна выкарыстоўваюцца наяўныя механізмы ў Міністэрстве гарадскога і сельскага будаўніцтва і ў Міністэрстве будаўніцтва БССР.

За апошнія два гады мала што зроблена для паляпшэння нарміравання працы і ўпарадкавання заработнай платы. На прамысловых прадпрыемствах, будоўлях і транспарце па-ранейшаму больш чым на 50 працэнтаў ужываюцца вопытна-статыстычныя нормы выпрацоўкі, якія не адпавядаюць сучаснаму ўзроўню развіцця тэхнікі і перадавой тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці.

Вядома, што рост прадукцыйнасці працы, побач з удасканаленнем тэхнікі, у значнай ступені залежыць таксама і ад узроўню кваліфікацыі кадраў. У рэспубліцы праароблена некаторая работа па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі рабочых. Аднак у гэтай справе ёсць яшчэ сур'ёзныя недахопы. Дрэнна выкарыстоўваюцца сродкі, якія адпускаюцца на гэтыя мэты, і не выконваюцца планы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў.

Трэба мець на ўвазе, што па вытворчаму стажу рабочы клас Беларусі параўнальна малады. У сувязі з гэтым неабходна рэзка ўзмацніць на прадпрыемствах падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі рабочых, як адну з важнейшых умоў росту прадукцыйнасці працы.

Дзяржаўныя планы выпуску валавой прадукцыі прамысловасцю рэспублікі на працягу ўсёй пяцігодкі былі выкананы: у 1951 годзе — на 103 працэнты, у 1952 годзе — на 104 працэнты, у 1953 годзе — на 103 працэнты, у 1954 годзе — на 105 працэнтаў і ў 1955 годзе — на 103 працэнты.

Але за агульнымі станоўчымі вынікамі нельга не бачыць таго, што многія прадпрыемствы і нават некаторыя галіны ў цэлым не выконваюць дзяржаўных заданняў. Сістэматычна не выконвае план Галоўнае ўпраўленне рыбнай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР (начальнік тав. Сацункевіч). У 1955 годзе не выканалі

план па выпуску валавой прадукцыі саюзныя трэсты Белпаперапром, Белфанзапалкадрэўпром, Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР (міністр тав. Ісідараў), «Гомсельмаш», Мінскі радыёзавод, Магілёўскі завод штучнага валакна, Добрушскі папяровы камбінат, Бабруйскі гідролізны завод і рад іншых прадпрыемстваў.

У сістэме Міністэрства мясцовай і паліўнай прамысловасці ў 1955 годзе не выканалі план 75 прадпрыемстваў з 294, у сістэме Міністэрства прамысловасці харчовых тавараў БССР — 79 прадпрыемстваў з 304. Вялікая колькасць прадпрыемстваў не выконвае планы ў сістэме промыславай кааперацыі. Народнай гаспадарцы недадаецца вялікая колькасць прадукцыі.

Тэмпы росту вытворчасці прамысловай прадукцыі былі-б у нас яшчэ большымі, калі-б поўнасцю выкарыстоўваліся рэзервы, калі-б усе галіны прамысловасці, усе без выключэння прадпрыемствы сістэматычна і поўнасцю выконвалі свае вытворчыя планы. Дабіцца гэтага — значыць забяспечыць новыя поспехі ў развіцці прамысловасці Беларусі.

Партыйныя арганізацыі рэспублікі ў апошні час пачалі больш удзяляць увагі пытанням удасканалення тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці, больш рашуча выяўляюць недахопы ў рабоце прадпрыемстваў і прымаюць меры да іх ліквідацыі. На высокім узроўні прайшлі на прадпрыемствах партыйныя і рабочыя сходы, прысвечаныя вынікам ліпеньскага Пленума ЦК КПСС. Комуністы і беспартыйныя рэзка крытыкавалі недахопы ў рабоце заводаў і фабрык, будоўляў і прадпрыемстваў, унеслі канкрэтныя практычныя прапановы па паляпшэнню іх работы. З вялікай актыўнасцю праходзіла абмеркаванне праектаў шостага пяцігадовага плана кожнага прадпрыемства ў сувязі са зваротам ЦК КПСС і Саюзнага ўрада.

Задачы далейшага развіцця і ўдасканалення нашай прамысловасці прад'яўляюць высокія патрабаванні да кіруючых кадраў прамысловасці. Кіраўнікі прадпрыемстваў абавязаны грунтоўна ведаць вытворчасць, быць энтузіястамі тэхнічнага прагрэсу, ведаць дасканала ўсё тое новае, прагрэсіўнае, што паяўляецца ў сусветнай тэхніцы, на перадавых прадпрыемствах нашай краіны па канкрэтнай галіне прамысловасці, і смела, настойліва ўкараняць гэтае новае на прадпрыемствах, якімі яны



Урадавая Бібліятэка
Інв. №
Імя ГОРКАГА
Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

кіруюць. Яны павінны быць не толькі добрымі арганізатарамі, але і высокаадукаванымі людзьмі, пісьменнымі ў тэхнічных адносінах, здольнымі паспяхова вырашаць пытанні гаспадарчай і тэхнічнай палітыкі.

Узраслі патрабаванні і да партыйных работнікаў. Кіраваць прамысловасцю ў сучасны момант — гэта значыць весці непрымірымую барацьбу з рутынай, коснасцю, адкрываць шырокую дарогу ўсяму новаму і перадавому, адмовіцца ад дэкларатыўнасці ў сваіх рашэннях, унікаць у справы прадпрыемстваў па сутнасці, глыбока разбірацца ў тэхніцы і эканоміцы вытворчасці. Значыць, нашы партыйныя работнікі павінны быць у курсе гэтых пытанняў, бываць на перадавых прадпрыемствах краіны, вывучаць іх вопыт, умець рабіць параўнанні і вывады, добра ведаць кадры, падбіраць для кіраўніцтва прамысловасцю таварышаў, здольных рухаць уперад тэхніку вытворчасці.

Сур'ёзныя недахопы ў рабоце раду партыйных камітэтаў па кіраўніцтву прамысловасцю тлумачацца перш за ўсё тым, што ў іх работнікаў не хапае ведаў і ўмення, каб разабрацца ў канкрэтных пытаннях вытворчасці. У рашэннях Мінскага гаркома партыі не раз асуджаліся штурмаўшчына, работа рыўкамі, бясконцыя аўралы і г. д. Аднак і да гэтага часу на заводах імя Варашылава, «Ударнік» і на радзе іншых прадпрыемстваў 50—60 працэнтаў запланаванай на месяц прадукцыі, як правіла, выпускаецца ў трэцяй дэкадзе. У Мінску, дзе сканцэнтравана большая частка прамысловасці рэспублікі, гаркому КПБ неабходна значна палепшыць сваё кіраўніцтва прамысловасцю горада.

Сярод работнікаў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту і сувязі Беларусі, як і ва ўсёй краіне, разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар XX з'езда КПСС. Многія калектывы прадпрыемстваў, змагаючыся за ажыццяўленне ўзятых абавязацельстваў, датэрмінова выканалі пяцігадовыя і гадавыя планы. Выраслі тысячы перадавікоў і наватараў вытворчасці, якія паказваюць узоры высокапрадукцыйнай работы. Можна назваць шліфоўшчыка трактарнага завода тав. Брызгаліна, стру-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы